# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

**Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 11 верасня 1997 года, чацвер, № 10 (1765)**


## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:


Наўрад ці знойдзецца хоць адзін чалавек, які б назваў прыёмную кампанію прыемнай. Нават калі ў экзаменацыйным лісце стаяць адныя пяцёркі. Няшмат людзей згадзіліся б яшчэ раз у сваім жыцці прайсці гэты шлях пакутаў і жахаў. А той, хто вытрымаў хоць раз, ужо герой. Гэтым адважным мы і прысвячаем матэрыял

Стар. 2

Пад яго націскам, воляй і майстэрствам "загінулі" швед, венгр, іранец, японец. Даўжэй за ўсіх змагаўся казах Курчаганаў. Сяргей Жардзецкі — чэмпіён з геафака

Студэнт заўсёды марыць аб стыпендыі, вялікай да неабсяжнасці. Каму такое па сілах? Чытайце матэрыял і дасягайце "глыбіняў" ведаў

Стар. 3

На сённяшні дзень на Беларусі афіцыйна зарэгістравана 1670 вірусаносьбітаў СНІДу. Для таго, каб ведаць дакладную іх колькасць, неабходна памножыць гэтую лічбу на дзесяць. Мы ведаем месца, дзе можна разгадаць таямніцу непераможнасці гэтай хваробы. Чытайце аб пошуках страчанага імунітэту

Стар. 4


# “З новым годам!”

— Гэта ненатуральна для універсітэта, калі ў яго памяшканнях не чуваць гоману студэнцкіх галасоў. Мне зусім не падабаецца, калі стук абцасікаў гулка аддаецца у вестыбюлі,— падзялілася сваімі ўражаннямі з карэспандэнтам "БУ" дырэктар універсітэцкай бібліятэкі Ірына Уладзіміраўна Арэхоўская напачатку святкавання ўсеагульнага свята студэнтаў і выкладчыкаў. Такое сцвярджэнне не абвергнеш. Але, на шчасце, час летніх канікулаў скончыўся. Замест выпускнікоў, якія сустрэлі верасень ужо на працоўных месцах, ва універсітэцкія аўдыторыі прыйшлі, як вядзецца ўжо больш за семдзесят гадоў, першакурснікі.

Першага верасня ў Белдзяржуніверсітэце, як і ва ўсіх навучальных установах краіны, ладзілася традыцыйнае свята — Дзень ведаў, пачатак новага навучальнага года. Першакурснікі ўсіх 13 факультэтаў БДУ, якім пашчасціла паспяхова прайсці праз усе выпрабаванні абітурыенцкай кампаніі (а гэта 2200 чалавек), сабраліся ў добраўпарадкаваным дворыку універсітэцкага гарадка каля галоўнага корпуса. Па праўдзе, спачатку было крыху дзіўнавата, хаваючыся ад спякотнага вераснёвага сонца, чуць віншаванні “З новым годам!” Але ўжо праз некалькі хвілінаў шчаслівыя ўсмешкі першакурснікаў стварылі атмасферу сапраўднага свята і ўрачыстасці. Яны — студэнты БДУ! Вядучай вышэйшай навучальнай установы ў сістэме нацыянальнай адукацыі. Сапраўды, для іх — гэта пачатак новага жыцця, падзея, якая вызначыла далейшы лёс, ажыццяўленне дзіцячых мараў. Думаецца, кожны, каму давялося вучыцца ў Белдзяржуніверсітэце, усломніў у гэты дзень тыя шчаслівыя хвіліны, калі ён толькі ступіў на універсітэцкія прыступкі.

Безумоўна, самы ўрачысты момант свята — уручэнне рэктарам БДУ Аляксандрам Уладзіслававічам Казуліным сімвалічнага студэнцкага білета першакурснікам. На гэты раз гонар атрымаць такі білет выпаў студэнтцы геаграфічнага факультэта Вользе Сідарэнка. Да таго ж у першакурснікаў была унікальная магчымасць пазнаёміцца з адміністрацыяй універсітэта, дэканамі факультэтаў, даведацца пра маладзёжныя арганізацыі, якія ёсць у БДУ. Са шчырай цікавасцю студэнты выслухалі віншавальныя словы аспіранта факультэта міжнародных адносін Джымі Інсубуга з далёкай краіны Уганда, які з'явіўся перад прысутнымі ў каларытным нацыянальным уборы. Пасля выканання студэнцкага гімна "Гаўдэамус" студэнты былі запрошаны ў актавую залу на канцэрт калектываў універсітэта. Магчыма, што хутка некаторыя першакурснікі самі стануць іх удзельнікамі.

*Таццяна КУХАРЧУК*

*Фота Г.КРАСКОЎСКАГА*



*Джымі Інсубуга — аспірант факультэта міжнародных адносін з Уганды*



*Рэктар БДУ Аляксандр Уладзіслававіч Казулін уручае сімвалічны студэнцкі білет першакурсніцы геаграфічнага факультэта Вользе Сідарэнка*



*Першакурснікі*

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

**ТЭЛЕТАЙП**

**Учора Сёння Заўтра**

*Фундаментальная бібліятэка Белдзяржуніверсітэта запрашае навуковых супрацоўнікаў, выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў азнаёміцца з навінкамі базы дадзеных PASCAL (CD-ROM дыскі за 1996 год і студзень-сакавік 1997 года). Апрача таго, бібліятэка атрымала на CD-ROM новую базу дадзеных FRANCIS па сацыяльна-гуманітарных навуках (1984-1996 гг.).*

Хуткім часам ў Белдзяржуніверсітэце плануецца адкрыць Цэнтр падтрымкі маладзёжнага прадпрымальніцтва, асноўнай задачай якога будзе аказанне дапамогі маладым людзям, якія жадаюць займацца камерцыйнай дзейнасцю ў межах ствараемага Цэнтра.

Запрашаем да супрацоўніцтва маладых людзей, якія маюць цікавыя ідэі, праекты, а таксама тых, хто ўжо сёння займаецца якімі-небудзь відамі гаспадарчай дзейнасці. Можна звяртацца на адрас: вул. Бабруйская, 7, пакой 417, тэл. 268-70-98.

Як паведамілі карэспандэнту “Беларускага універсітэта” ў прафкаме супрацоўнікаў БДУ, мінулым летам за кошт прафсаюза паправілі свае здароўе ў санаторыях і дамах адпачынку Беларусі 74 супрацоўнікі універсітэта. Прычым кошт пуцёвак складаў толькі 20 працэнтаў ад поўнага. Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва выдзеліў гэтым разам для БДУ толькі 21 пуцёўку ў санаторыі Беларусі.

Акрамя таго, работнікі універсітэта ў чэрвені і ліпені мелі магчымасць разам з дзецьмі адпачываць у санаторыі-прафілакторыі ў Шчомысліцы — там пабывала 127 чалавек. Той, хто хацеў правесці свой адпачынак асобна ад дзяцей, мог набыць для іх пуцёўку (за 10 працэнтаў ад поўнага кошту) у дзіцячы аздараўленчы лагер. Усяго за тры змены там прабавілі лета 157 дзяцей супрацоўнікаў нашага універсітэта.

# Прыёмная кампанія ў асобным БДУ

*Наўрад ці знойдзецца хоць адзін чалавек, які б назваў прыёмную кампанію прыемнай. Нават калі ў экзаменацыйным лісце стаяць адныя пяцёркі. Няшмат людзей згадзіліся б яшчэ раз у сваім жыцці прайсці гэты шлях пакутаў і жахаў. А той, хто вытрымаў хоць раз, ужо герой. Гэтым адважным мы і прысвячаем наступны матэрыял.*

Агульнымі намаганнямі абітурыенты заусёды перавыконваюць план прыёму ва універсітэт. Вось і ў гэтым годзе за права заняць у аўдыторыях 1701 месца змагаліся 4141 чалавек. Яшчэ 1103 абітурыенты вытрымлівалі жудасную канкурэнцыю, каб стаць завочнікамі, бо запланаваны быў набор толькі 400. Так і атрымалася, што ў сярэднім па універсітэту конкурс на дзённае навучанне быў амаль два з паловай чалавекі на месца, а на завочнае — крыху больш за гэтую лічбу. На фоне іншых навучальных установаў рэспублікі універсітэт, як заўсёды, выглядаў найлепшым чынам, уступаючы па прэстыжнасці хіба толькі прызнаным лідэрам — Лінгвістычнаму і Эканамічнаму універсітэтам. А былі ж у нас і спецыяльнасці, на якіх барацьба дасягала найвышэйшага накалу. Найдаражэй (у плане затрачаных нерваў і глыбіні ведаў) каштавалі крэслы на спецыяльнасці псіхалогія (больш за пяць з паловай) і менеджмент (крыху больш за пяць чалавек на месца) філасофска-эканамічнага факультэта. Сёлетняя абітурыенцкая кампанія паказала, што ў адвечнай спрэчцы фізікаў і лірыкаў лідыруюць цяпер менавіта апошнія. Што ж датычыць канкрэтных спецыяльнасцяў, дык радыёфізікі ледзь-ледзь "нашкрэблі" неабходную колькасць студэнтаў — конкурс быў катастрафічна нізкі (1.07 чалавека на месца). Дарэчы, тэхнічныя ВНУ Беларусі мелі такія ж паказчыкі амаль па ўсіх спецыяльнасцях. У той жа час усё больш людзей хацелі бы прысвяціць сябе змаганню з экалагічнымі праблемамі ў нашай краіне. Вось чаму на спецыяльнасць "Экалогія" біяфака конкурс значна ўзрос. Адзін з трох жадаючых абараняць прыроду атрымаў магчымасць навучыцца гэтаму ва універсітэце. Асабліваю сёлетняга прыёму стала і тое, што па некаторых спецыяльнасцях колькасць пераможцаў алімпіяд і медалістаў амаль дасягала колькасці запланаваных месцаў. Гэта толькі лішні раз падкрэслівае прэстыж універсітэта. Дарэчы, самы высокі прахадны бал быў у абітурыентаў спецыяльнасці "Сацыялогія", а таксама "Інфармацыя і камунікацыя" філасофска-эканамічнага факультэта, "Міжнароднае права і міжнародныя адносіны" факультэта міжнародных адносін.

У кожнай кампаніі, асабліва абітурыенцкай, знойдзецца той, хто будзе незадаволены атрыманай на экзамене адзнакай. Ва універсітэце такіх было толькі 82 чалавекі. Абскарджанне 70 з іх было абвергнута падчас паўторнага іспыту. Астатнія атрымалі больш высокую адзнаку. Лічбы сведчаць, што аб'ектыўнасць выкладчыкаў была амаль ідэальнай, і ў даведачна-інфармацыйную службу, якая па сумяшчальніцтву выконвала яшчэ і ролю бюро скаргаў, немагчыма было дазваніцца па тэлефоне зусім па іншых прычынах. Усхвалявaныя бацькі і дзеці проста лішні раз удакладнялі, пераправяралі, раіліся з дасведчанымі людзьмі.

Як заўсёды, для многіх абітурыентаў былі запланаваны сюрпрызы. Пашанцавала, напрыклад, пяці абітурыентам журфака. Не прайшоўшы ні па прахадному, ні па паўпрахадному балу, яны былі ўсё ж прынятыя ва універсітэт па мэтавым кантрактным прыёме. Закончыўшы універсітэт, кожны з іх павінен будзе тры гады адпрацаваць менавіта ў той рэдакцыі, з якой падпісаў кантракт.

Упершыню ў гэтым годзе гісторыкі ў якасці эксперыменту пісалі сачыненне па сусветнай гісторыі найноўшых часоў. Яны цягнулі білеты і, такім чынам, для кожнага тэма была асобнай. Вось гэта жартачкі для ахвотнікаў здаваць экзамены па шпаргалках! Столькі міні-навуковых даследаванняў не напішаш за ўвесь год, не тое, што за ноч перад экзаменам.

Абітурыенты і не ведаюць, што па выніках кожнага экзамена старшыні прадметных камісіяй пішуць свае пісьмовыя работы, дзе аналізуюць усе недахопы і выказваюць свае прапановы. Экзаменатары па дысцыпліне "Чалавек і грамадства", напрыклад, адзначылі, што не хапае новых падручнікаў, якія б адлюстроўвалі сучасны ўзровень сацыяльна-гуманітарных ведаў. Выкладчыкі замежных моваў з задавальненнем успрынялі новую сістэму адзнак, дзе ўлічваюцца "палавінкі". Гэта выключыла ранейшыя цяжкасці з выстаўленнем адзнак і дазваляе быць больш аб'ектыўнымі. Цікава, што выбіраючы мову для здачы пісьмовага і вуснага экзаменаў, большасць гуманітарыяў аддала перавагу беларускай. Што непакоіць універсітэцкіх літаратуразнаўцаў, дык гэта тое, што адказы паступаючых сведчаць аб іх выдатных здольнасцях да "зазубрывання" матэрыялу, а не аб магчымасці аналізаваць літаратурныя творы самастойна. Узровень ведаў 280 гісторыкаў, як і магчымасць іх падачы, якія выявіў пісьмовы экзамен, пакідаюць жадаць лепшага. Нават у самых простых пытаннях абітурыенты не заўсёды могуць свабодна аперыраваць інфармацыяй і аналізаваць паслядоўна шэраг падзей. Пісьмовыя адказы мелі павярхоўны, канспектыўны характар. Прааналізаваўшы адказы па геаграфіі, выкладчыкі зрабілі сумную выснову: у школах, пэўна, не хапае атласаў і мапаў, бо падчас работы з імі абітурыенты мелі цяжкасці. А калі казаць у цэлым, дык усе экзаменатары адзначалі высокі ўзровень ведаў выпускнікоў ліцэя пры БДУ і многіх сталічных школаў і наракалі на ўзровень падрыхтоўкі вясковых вучняў.

Прыёмная кампанія адыйшла ў мінулае. Той, каму пашанцавала (мы ж не будзем абвяргаць, што ў паспяховым заканчэнні экзамена адыгрываюць вялікую ролю не толькі выдатныя веды і здольнасць запэўніць у іх наяўнасці экзаменатараў, але і шчаслівы выпадак), сёння наведвае ўжо універсітэцкія аўдыторыі. Іх мы шчыра віншуем і раім не расхалоджвацца — вам так пакуль не здаецца, але хутка сесія. Школьных ведаў у падрыхтоўцы да яе недастаткова.

*Марына АВЕРКІНА*



# Шлях насустрач

*Падчас свайго візіту на Беларусь Луіс Марэна, які ўзначальвае прадстаўніцтва Еўрасаюза на Украіне і на Беларусі, сустракаўся не толькі з прэм'ер-міністрам Сяргеем Лінгам і іншымі афіцыйнымі асобамі дзяржаўнага ўзроўню. Асобным пунктам пазначана было наведванне Белдзяржуніверсітэта.*



*На здымку: спадар Луіс Марэна верыць у светлую будучыню падпісаных пагадненняў.*

Падпісаны першы буйны праект паміж Еўрапейскай супольнасцю і Цэнтрам Еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі універсітэта. Кантракт, які прадугледжвае пераклад асноўных дакументаў Еўрасаюза з ангельскай на беларускую мову і апублікаванне іх у нашай краіне, павінен быць выкананы да 1 сакавіка наступнага года.

Спадар Марэна лічыць гэты першы крок да шчыльнага супрацоўніцтва вельмі важным. Дзякуючы яму ўрад і народ Беларусі змогуць атрымліваць больш неабходнай інфармацыі аб дзейнасці Еўрасаюза. З універсітэцкага боку свой подпіс пад дакументам паставіў прарэктар па вучэбнай і інфармацыйнай аналітычнай рабоце Аляксандр Мікалаевіч Курбацкі.

— Усе мы еўрапейцы і маем агульныя каштоўнасці. Беларусь якраз і ёсць тая самая краіна, што заслугоўвае вялікай увагі з боку Еўрапейскага камітэта, які з 1989 года актыўна ўдзельнічае ў пераўтварэннях грамадзянскага грамадства ў Еўропе, — падагуліў вынік афіцыйнай дамоўленасці Луіс Марэна і паабяцаў у бліжэйшы час наведвацца ў госці кожны месяц. Такім чынам, у яго паявіцца выдатная магчымасць на ўласныя вочы запэўнівацца ў поспехах Цэнтра. Тут ужо створаны савет, у які ўвайшлі выкладчыкі і аспіранты, што займаюцца ў свaёй навуковай дзейнасці праблемамі інтэграцыі ў Еўрапейскую супольнасць, рыхтуецца міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Рэспубліка Беларусь і Еўрапейскі Саюз: шлях насустрач".

*Марына АВЕРКІНА*



# Турызм — гэта зусім не "шоп-туры"

*З гэтага года на факультэце міжнародных адносін пачалі рыхтаваць спецыялістаў па менеджменту ў галіне міжнароднага турызму.*

Фірма "Белінтурыст" павінна ўспрыняць гэтую навіну з вялікай радасцю, таму што менавіта такія спецыялісты спатрэбяцца ёй у той самы час, калі адбудзецца першы выпуск па гэтай спецыяльнасці. Чым яна адрозніваецца ад існуючых ужо ў камерцыйных ВНУ? Больш глыбокай падрыхтоўкай. Скажам, на вывучэнне асноўнай замежнай мовы ў вучэбным плане тут адведзена 1103 гадзіны заняткаў. Дадайце да іх яшчэ тэорыю і практыку перакладу, а таксама другую замежную мову, на якую даецца 736 гадзін, і вы адчуеце розніцу. Увогуле навучанне па гэтай спецыяльнасці абяцае быць цікавым. Тут вам і асновы дыпламатыі, і міжнароднае права, і эканоміка ва ўсіх сваіх праявах, і нават тэорыя верагоднасці. Кадраў, якія будуць падрыхтаваныя на факультэце міжнародных адносін, якраз хопіць для нашай краіны. Гэта 15 студэнтаў, што вучацца на дзённым аддзяленні, і 11 "платнікаў". І займацца яны будуць зусім не арганізацыяй "шоп-тураў", як стала модным зараз у шырокіх колах дробных прадпрымальнікаў, а ўпраўленчай работай у сферы міжнароднага турызму. Дарэчы, патрэбу ў такіх спецыялістах маюць усе консульскія службы.

Пакуль першакурснікі вывучаюць толькі базавыя курсы. Іх чытаюць у асноўным выкладчыкі факультэта. У перспектыве зусім верагодна стварэнне на факультэце кафедры міжнароднага турызму.

*Зінаіда МАРАВА*

# Англійскі, французскі, нямецкі, італьянскі...

*У гэтым навучальным годзе ў нашым універсітэце на некаторых факультэтах распачалася падрыхтоўка студэнтаў па новых спецыяльнасцях. З'явіліся такія спецыяльнасці і на філалагічным факультэце. Больш падрабязна пра гэта карэспандэнт "Беларускага універсітэта" Таццяна КУХАРЧУК папрасіла расказаць намесніка дэкана па вучэбна-метадычнай рабоце Святлану Якаўлеўну ГАНЧАРОВУ:*

— Сапраўды, у гэтым годзе мы набралі 15 чалавек на спецыяльнасць італьянская мова і літаратура. Што да такіх спецыяльнасцяў, як англійская мова і літаратура, французская мова і літаратура, нямецкая мова і літаратура, то яны таксама адносна новыя і існуюць на факультэце два гады.

*— Святлана Якаўлеўна, скажыце, калі ласка, а дзе яшчэ ў Беларусі рыхтуюць такіх спецыялістаў?*

— Вядома ж, спецыялістаў у галіне замежных моваў выпускае Лінгвістычны універсітэт. Але яны рыхтуюць лінгвістаў. Таксама, як і Гродзенскі універсітэт. Мы ж, акрамя дасканалага ведання мовы, звяртаем вялікую ўвагу на літаратуру краінаў, мову якіх вывучаем. Такім чынам, рыхтуем філолагаў. Увогуле, тут мы бачым вялікія перспектывы — у хуткім часе адкрываецца новая кафедра рамана-германскіх моваў. Да таго ж ёсць ужо планы ў наступным годзе пачаць падрыхтоўку спецыялістаў па японскай мове і літаратуры.

# Новыя часопісы

**Адна з найважнейшых крыніцаў папаўнення фондаў Фундаментальнай бібліятэкі Белдзяржуніверсітэта газетамі і часопісамі — падпіска, якая праводзіцца раз на паўгода. Велізарная колькасць перыядычных выданняў, якія выпісвае бібліятэка, мае разнастайную тэматыку.**

Чарговая падпісная кампанія (на 2-ю палову 1997 года) уражвае сваімі памерамі — 1 539 105 300 беларускіх рублёў. Амаль такая ж сума была выдатканая на камплектаванне бібліятэкі за ўвесь 1996 год: закупка літаратуры, бібліятэчнай тэхнікі, перасылка і ўпакоўванне літаратуры, падпіска на абодва паўгоддзі.

На працягу гэтай падпіснай кампаніі бібліятэка выпісала 562 назвы (1443 экземпляры) перыядычных выданняў. Гэта газеты і часопісы, што выпісваліся як з году ў год, так і ўпершыню сёлета.

З гэтага паўгоддзя бібліятэка будзе атрымліваць 53 новыя перыядычныя выданні (48 часопісаў і 5 газетаў). Згадаем некаторыя з іх.

*"АТЭСТАЦЫЯ"*

Гэта штоквартальны навукова-тэарэтычны і інфармацыйна-метадычны часопіс, заснаваны ВАК Беларусі. У часопісе друкуюцца нарматыўныя дакументы і каментарыі да іх, асвятляецца айчынны і замежны вопыт дзейнасці атэстацыйных органаў, публікуюцца звесткі пра новых кандыдатаў і дактароў навук, дацэнтаў і прафесараў, а таксама пра іх дасягненні ў галіне навукі, тэхнікі і навукова-педагагічнай дзейнасці.

*"ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА"*

Гэта першы ў нашай краіне штоквартальны навукова-метадычны і інфармацыйны часопіс для метадыстаў, прафесараў і студэнтаў, навуковых супрацоўнікаў і аспірантаў. У часопісе прадстаўляюцца публікацыі па-беларуску і па-руску па актуальных праблемах жыцця вышэйшай школы ў Беларусі і за мяжой.

*"УНИВЕРСИТЕТСКАЯ КНИГА"*

Расійскі штомесячны часопіс, які асвятляе пытанні стварэння, выдання, распаўсюджвання і выкарыстання навучальнай, навуковай і даведачнай літаратуры для універсітэтаў. Часопіс друкуе праблемныя артыкулы, афіцыйныя дакументы, інфармацыю пра навінкі навучальнай літаратуры, рэцэнзіі і фрагменты кніг, а таксама нататкі пра найважнейшыя падзеі ў сферы кнігавыдання для ВНУ.

Першыя нумары вышэйпералічаных часопісаў бібліятэка ўжо атрымала.

Знойдуць сваіх чытачоў і такія новыя часопісы, як "Інфарматызацыя адукацыі", "Кіраванне ў адукацыі", "Тэхналагічная адукацыя", "Образование и рынок". Усе яны папоўняць фонд чытальнай залы для прафесарска-выкладчыцкага саставу і аспірантаў.

Сучасную ВНУ цяжка ўявіць без аўтаматызацыі, камп'ютэрызацыі, новых перадавых тэхналогіяў. Гэтым тлумачыцца тое, што бібліятэка выпісала 12 назваў часопісаў па вылічальнай тэхніцы і праграмаванню: "Мир компьютерной автоматизации", "Мир Internet", "Системы управления базами данных", "Журнал сетевых решений", "Программные продукты и системы" і інш.

Хаця перыядычныя выданні даражэюць з кожным паўгоддзем, львіная доля падпісных грошай выдаткоўваецца на рэфератыўныя часопісы. Сёння бібліятэка выпісвае 21 рэфератыўны часопіс амаль на 800 млн. рублёў.

Бібліятэка выказвае вялікую падзяку кіраўніцтву юрыдычнага факультэта ў асобе дэкана В.М.Гадунова, а таксама хімічнага — у асобе дэкана Г.А.Браніцкага, якія змаглі аказаць нам фінансавую дапамогу і аплацілі частку перыядычных выданняў сваімі сродкамі. Так, юрыдычны факультэт выдаткаваў 12 402 100 рублёў, а хімічны факультэт ужо не першы год усю сваю падпіску аплочвае сам (37 533 000 рублёў). Вядома, супрацоўнікі бібліятэкі жадалі б бачыць як мага болей такіх памочнікаў.

Хацелася б запрасіць дэканаў факультэтаў, загадчыкаў кафедраў да ўзаемакарыснага супрацоўніцтва як адносна падпіскі, так і адносна камплектавання бібліятэкі літаратурай. З усімі пытаннямі можна звяртацца ў аддзел камплектавання і каталагізацыі (пакой 223, тэл. 220-71-79)

*А.БУЦІНА,*
*заг. аддзела камплектавання і каталагізацыі бібліятэкі БДУ*





# Сяргей ЖАРДЗЕЦКІ — чэмпіён з геафака



Мы вельмі спачуваем апошняму праціўніку Сяргея Жардзецкага. Перамога падчас апошняга бою была побач, але рукамі дакрануўся да яе менавіта студэнт 4 курса геафака. І стаў чэмпіёнам свету сярод моладзі па грэка-рымскай барацьбе. Пад яго націскам, воляй і майстэрствам "загінулі" швед, венгр, іранец, японец. Даўжэй за ўсіх змагаўся казах Курчаганаў.

У чэмпіянаце свету па грэка-рымскай барацьбе ўдзельнічалі 272 спартсмены з 46 камандаў. Сяргей перамог у вагавай катэгорыі 60 кг сярод 32 удзельнікаў. Яго ўласны поспех лепшым чынам адбіўся на становішчы Беларусі ў турнірнай табліцы. Наша краіна стала трэцяй у агульнакамандным заліку пасля Расіі і Украіны.

*Уладзімір МІХАЙЛАЎ*



# Дэлегацыя маладзёжных арганізацыяў Ягелонскага універсітэта

З 8 па 12 жніўня па запрашэнню Студэнцкага саюза наш універсітэт наведала дэлегацыя маладзёжных арганізацыяў Ягелонскага універсітэта — адна з найстарэйшых універсітэтаў Еўропы. Польскія калегі сустрэліся з прарэктарам па вучэбна-выхаваўчай рабоце і быту А.В.Паўлавым, начальнікам упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю А.Б.Багдановічам, начальнікам упраўлення міжнародных сувязяў В.Г.Шадурскім, намеснікам дэкана факультэта міжнародных адносінаў М.Э.Часноўскім. Асаблівую цікаўнасць госці з Кракава выказалі да арганізацыі сацыяльнай работы ў Белдзяржуніверсітэце, да жыцця студэнтаў у інтэрнатах. За пяць дзён падчас культурнай праграмы прадстаўнікі польскіх маладзёжных арганізацыяў азнаёміліся з гісторыяй нашага універсітэта, горада, краіны. Вынікам візіту стала падпісанне Дагавора аб супрацоўніцтве паміж Камісіяй самакіравання студэнтаў Ягелонскага універсітэта і камітэта Студэнцкага саюза БДУ, які прадугледжвае супрацоўніцтва ў рэалізацыі сумесных праграмаў і спрыяе далейшаму ўмацаванню сувязяў маладзёжных арганізацыяў абодвух універсітэтаў.



*Сяргей ДЗІЕСПЕРАЎ,*
*старшыня Студэнцкага саюза БДУ*



# Аб якой стыпендыі мы марым

Віцэ-прэзідэнт фірмы "Джэнерал электрык - Авіяцыйныя рухавікі" па Расіі і СНД Трэйсі Хомбург уручыў дзесяць імянных стыпендый па 1000 долараў студэнтам будаўнічых факультэтаў шасці расійскіх ВНУ (па 100 долараў за кожны месяц навучальнага года).

Усе яны вучацца на чацвёртым і пятым курсах і будуць атрымліваць амерыканскія стыпендыі да канца навучання. Іншагароднім студэнтам кампанія аплочвае яшчэ кошт праезду да Масквы, каб атрымаць стыпендыю, а таксама два дні пражывання ў сталіцы.

Мэта гэтых заахвочванняў, як гаворыць віцэ-прэзідэнт кампаніі Трэйсі Хомбург, не ў тым, каб "перакупіць" расійскія таленты, а каб "адзначыць лепшых студэнтаў сённяшняга дня — патэнцыяльных прафесіяналаў высокага класа ў будучым". У фірмы больш за 200 сумесных прадпрыемстваў па ўсім свеце, дзе паспяхова працуюць дзесяткі тысяч самых высокакваліфікаваных спецыялістаў розных нацыянальнасцей. Ёсць у яе і доўгатэрміновыя перспектывы сумесных работ і ў Расіі. Таму падтрымка добра адукаваных спецыялістаў — зусім не лішні клопат.

Дарэчы, фірма штогод выдаткоўвае на навукова-даследчыя і канструктарскія работы каля 2 мільярдаў долараў. 10 тысячаў "зялёных" на падтрымку расійскіх талентаў для яе не вельмі вялікія выдаткі, нават калі сённяшнія студэнты заўтра памяняюць прафесію. Затое які прыклад для пераймання айчынным бізнесменам!

Студэнтаў нашага універсітэта фінансава падтрымлівае пакуль толькі дзяржава. Са спецыяльнага фонду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь выдзелены чатыры стыпендыі для самых адораных студэнтаў. Вартых атрымліваць іх, трэба сказаць, нямала. Вось чаму, каб нікому крыўдна не было, факультэтам даводзіцца перадаваць гэтую пачэсную эстафету кожны год. У гэтым — пашанцавала хімікам і юрыстам, а таксама выдаткам факультэтаў радыёфізікі і электронікі, міжнародных адносін. Гэта ні многа ні мала, а цэлых 6 мінімальных заробкаў. Ёсць яшчэ і імянныя стыпендыі. Напрыклад, стыпендыі Францыска Скарыны атрымліваюць ва універсітэце 20 студэнтаў. Грашовае выражэнне гэтай узнагароды — 390 працэнтаў ад мінімальнай заработнай платы. Самы багаты на імянныя стыпендыі філфак. Акрамя стыпендыі Францыска Скарыны, 5 студэнтаў гэтага факультэта атрымліваюць павышаную "зарплату" імя Купалы, Коласа, Карскага, Броўкі, Крапівы. Журналісты маюць стыпендыю імя Багдановіча, а географы — імя Танка. Астатнія вымушаныя атрымліваць тое, што заслужылі, у залежнасці ад атрыманых у апошнюю сесію адзнак.

*Уладзімір МІХАЙЛАЎ*

# Журналісты выратуюць свет

***Некаторыя з беларускіх ВІЧ-інфіцыраваных зусім не наркаманы. СНІД распаўсюджваецца ўсё часцей не толькі з удзелам шпрыца, але і палавым шляхам. Такім чынам, прадказанні медыкаў аб росце колькасці інфіцыраваных да 5-6 тысяч могуць выглядаць яшчэ больш змрочна.***

Дарэчы, у Афрыцы інфіцыравана да 60% жыхароў. У адным з праведзеных там даследаванняў прымалі удзел 5% цяжарных жанчын. Трэцяя частка з іх была інфіцыравана. Няўрымслівае афрыканскае насельніцтва наўрад ці пагодзіцца з прапановай не пакідаць межы асабістага кантынента. У такой сітуацыі чалавецтва можа выратаваць толькі адданасць кожнага прынцыпу: беражонага Бог беражэ. Кансультант ЮНІСЭФ Леа Кені лічыць, што навучыць людзей правілам жыцця ў небяспечнай сітуацыі павінны журналісты. Ён, дарэчы, вельмі ўхваляе імкненне беларускіх прадстаўнікоў СМІ звяртаць большую ўвагу на праблему СНІДу і друкаваць усе матэрыялы па гэтай тэматыцы бясплатна.

— З заходняй прэсай дамовіцца цяжэй. Там не прызнаюць ніякіх абавязкаў перад грамадствам. У пагоні за накладам і грашыма журналісты гатовыя зрабіць сенсацыю з любой інфармацыі аб адкрыцці панацэі ад СНІДу. Не болей таго.

У ЗША, Аўстраліі, Швецыі вядзецца адкрытая дыскусія па пытаннях прастытуцыі, наркотыкаў, гомасексуалізму. А ў Польшчы — моцная каталіцкая царква, якая зусім не ўхваляе гутаркі на гэтую тэму. Таму там данесці да насельніцтва інфармацыю аб пагрозе гэтай хваробы практычна немагчыма.

**— Вы ўсур'ёз далучаеце прэсу да немедыкаментозных сродкаў папярэджання СНІДу?**

— А як інакш? У яе ўладзе паўплываць на менталітэт народа. З другога боку, палохаць грамадскасць таксама нельга. Вось чаму я не ілюстраваў бы артыкул аб гэтай жахлівай хваробе малюнкамі з чалавечымі чарапамі, як гэта робяць часта газеты ўсяго свету. Заклікі заганяць ВІЧ-інфіцыраваных у рэзервацыі альбо знішчаць з твару зямлі могуць прывесці да таго, што, разлаваўшыся, многія з іх зоймуцца біялагічным тэрарызмам. Вы самі калі-небудзь мелі размову з ВІЧ-інфіцыраванымі?

— Не.

— Я чатыры гады пражыў у Намібіі. Добра ведаў 10 чалавек, якія памерлі ад СНІДу. Толькі падумайце, якая колькасць ВІЧ-інфіцыраваных была там вакол мяне, калі дзесяць добра вядомых паспелі памерці за гэты час! Паказальна, што гэтыя людзі мелі высокае становішча ў грамадстве. Дыпламаты, прадстаўнікі ўрадавых, дзелавых колаў.

**— Вы ведалі пра тое, што яны хворыя?**

— Не заўсёды. Няшмат хто насмельваецца гаварыць пра хваробу адкрыта. Непрыняцце грамадствам ВІЧ-інфіцыраваных — з'ява міжнародная. Нехта пахудзеў прама на вачах, у кагосьці, лічылася, быў рак, іншы пастаянна пакутаваў на прастуду. А потым яны паміралі. Сярод простага насельніцтва хвароба таксама квітнела. Гэтаму пасадзейнічала і партызанская вайна на поўдні Афрыкі.

Вам не варта супакойвацца адносным дабрабытам. Раёны, дзе зафіксавана ўспышка, блізкія да Украіны. Там сітуацыя значна горшая. Гандлёвыя і транспартныя шляхі, якія праходзяць праз Беларусь, ужо можна назваць рассаднікамі інфекцыі. Вашыя суседзі Польшча і Літва ўжо асцерагаюцца блізкасці з Беларуссю.

*Марына АВЕРКІНА*

# У ПОШУКАХ СТРАЧАНАГА ІМУНІТЭТУ

*На сённяшні дзень на Беларусі афіцыйна зарэгістравана 1670 вірусаносьбітаў СНІДу. Для таго, каб ведаць дакладную іх колькасць, неабходна памножыць гэтую лічбу на дзесяць. Ужо зразумела, што навала не абміне нашу краіну. Таму даследаванні лабараторыі вывучэння СНІДу Беларускага НДІ мікрабіялогіі і вірусалогіі на сённяшні дзень вельмі актуальныя. Адрас гэтай лабараторыі шырока не афішыруецца. На дзвярах з кодавым замком — папераджальная шыльда: "Пабочным асобам уваход забаронены!" Тут у амфары з вадкім азотам пры тэмпературы мінус 192 °С ці засушаным у лядоўні захоўваецца вірус, які наводзіць жах на ўсіх жыхароў планеты. Тут можна разгадаць таямніцу яго непераможнасці.*

Знешне вірус выглядае зусім міралюбіва. Быццам мікраскапічны дзьмухавец. Знешнасць падманлівая, таму што не паспелі насельнікі Зямлі адкрыць гэтую мікраскапічную істоту, як яна паказала свой нораў. Вірус адразу займеў рэпутацыю не толькі ворага чалавека, але і скандаліста. Ён справакаваў спрэчку двух паважаных вучоных і пасварыў дзве дзяржавы. Адбылося гэта так. Француз Люк Мантанье выдзяліў у інстытуце Пастэра ў Парыжы загадкавы вірус і вырашыў пракансультавацца ў свайго сябра амерыканца Роберта Гало, які працаваў у Нацыянальным інстытуце раку ў ЗША. Апошні добра папрацаваў над яго расшыфроўкай і настолькі ўвайшоў у ролю, што і сам паверыў у тое, што выдзяліў гэтага падобнага на шар малога з чалавечага арганізму ўласнаручна. Спрэчку спынілі міжнародныя арбітры, якія засведчылі, што вірус СНІДу быў выдзелены ўсё ж Мантанье. Але да гэтае пары амерыканскія крыніцы сведчаць, што першаадкрывальнікам быў Гало. А нашы дыпламатычна падкрэсліваюць аўтаномнасць кожнага з гэтых адкрыццяў.



Ніводны член сямейства вірусаў не выклікаў такой зацікаўленнасці вучонага свету. За трынаццать гадоў, якія прайшлі з таго часу, зроблена столькі, колькі ні ў адной з галінаў вірусалогіі. Нашмат меней ведаюць спецыялісты аб вірусах адзёру, паратыту, воспеннай вакцыне. (Гэта, дарэчы, не перашкодзіла ім даўным-даўно перамагчы воспу. У 1998 годзе, магчыма, будзе канчаткова забіты асінавы кол у два пакуль што існуючых на планеце захавальнікі натуральнай воспы.) А да перамогі над СНІДам вучоныя не наблізіліся ні на крок.

Створаныя тры пакаленні вакцынаў. Кожную трэба было дасканала праверыць. Спачатку шукалі мадэлі для эксперыменту. Перабралі шмат жывёлаў і выбралі толькі шымпанзе. Гэтая малпа каштуе, як жартуюць вучоныя, даражэй за чалавека. Для даследаванняў патрэбна мець не меней за 10-15 жывёлаў. Гэта не пад сілу нават эканамічна сталым краінам. Тым пасля ўвядзення вакцыны людзі хварэлі так, як і без яе выкарыстоўвання.

Беларускія вірусолагі пачалі ствараць жывёльную мадэль тады, калі ва ўсім свеце ўжо лічылі бесперспектыўнымі спробы знайсці яе. Проста таму, больш крыўдна, што вірус, як аказалася, прыжываўся ў арганізме шымпанзе, але клінікі захворвання не выклікаў. Хаця, па адной з версій, СНІД "скокнуў" на чалавека з малпы, ён настолькі імкліва відазмяніўся, што малпу ім цяпер нельга заразіць.

Эксперыменты ставіліся і на людзях. Спонсарамі выступалі развітыя краіны. Валанцёраў адбіралі ў асноўным з Афрыкі, дзе колькасць хворых катастрафічна вялікая. Вакцыны спрабавалі выкарыстоўваць яшчэ і для лячэння інфіцыраваных. Гарантаваць выздараўленне ніхто не браўся. Затое плацілі добрыя грошы. Пагроза, з якой сутыкаліся здаровыя добраахвотнікі, ацэньвалася даражэй. Хворым, якія практычна нічога не гублялі, плацілі меней. Але ўсё роўна ў межах некалькіх сотняў тысячаў долараў. На жаль, што яшчэ не ведалі аб адмоўных выніках эксперыментаў замежных калег. Роль паддоследных выконвалі хлопкавыя пацукі. Дарэчы, выдзелены на Беларусі штам (так называюць вірус, які ізалявалі з інфіцыраванага арганізму, вырасцілі ў штучных умовах і даследавалі па ўсіх параметрах) аказаўся вельмі пладавітым. Ён памнажаецца ў сто разоў хутчэй за вірус, які адкрыў Гало. Сем удзельнікаў эксперыменту хутка памерлі. Некаторыя страцілі валасяныя пакровы. У 80 працэнтаў жывёлаў знешніх прыкметаў захворвання не было. Павярхоўныя вірусалагічныя даследаванні таксама не давалі вынікаў. Толькі метад малекулярна-біялагічнага пошуку віруса — палімеразна-ланцуговая рэакцыя — дазволіў выявіць праз шэсць месяцаў заражаныя клеткі ў мазгу і селязёнцы пацукоў. Гэта даказвала, што чалавечы вірус усё ж прабіў абарону ў арганізме хлопкавага пацука. Супрацоўнікі лабараторыі стварылі ўсё ж мадэль, на якой цяпер можна правяраць любую вакцыну ці лекавы прэпарат. Калі праз 5-6 месяцаў пасля ўвядзення вірус не будзе выяўлены ў арганізме жывёлаў, значыць, прэпарат перамагае СНІД. Шкада толькі, што паўтарыць гэты эксперымент цяпер немагчыма. Для яго пастаноўкі не хопіць бюджэтнага фінансавання ўсяго інстытута эпідэміялогіі і мікрабіялогіі. Кожны з двухсот неабходных пацукоў каштуе сёння 3-4 долары. Патрабуюцца яшчэ прэпараты і абсталяванне.

Сёння ва ўсім свеце ўжо не вераць у магчымасць адкрыцця эфектыўнай вакцыны. Гэты сродак барацьбы з хваробай разлічаны на аднаўленне імунітэту арганізма. СНІД жа, у адрозненне ад астатніх вірусаў, паражае лімфоідную тканку, якая і з'яўляецца адным з галоўных генератараў імунітэту. Гаворачы прасцей, ён жыве тым, што паглынае выпрацаваныя антыцелы. Да таго ж, ён так імкліва відазмяняецца (у сто разоў хутчэй за вірус грыпу), што няма гарантыі эфектыўнасці распрацаванай вакцыны не толькі ў адным рэгіёне, але і ў арганізме аднаго чалавека.

СНІД кожны раз абводзіць навукоўцаў вакол пальца. Страціўшы ілюзіі, яны занятыя цяпер пошукам хімічнага прэпарата, які б затрымаў прагрэсіраванне хваробы. Амерыканскі прафесар Дэйв Хо пайшоў па шляху блакіроўкі віруса ў арганізме, выкарыстоўваючы для гэтага два вядомыя прэпараты: азітацымізід і так званы інгібітар пратэазы. Эфект іх уздзеяння заўважны, праўда, толькі на ранніх стадыях заражэння. У такім выпадку хвароба выяўляецца, як правіла, выпадкова. Таму што знешне арганізм выглядае амаль здаровым. Трэці прэпарат, пра які прафесар Хо пакуль маўчыць, па ўсіх канонах навукі павінен стаць яго асабістым адкрыццём. Беларускія вірусолагі пад кіраўніцтвам прафесара Пятра Рыціка шукаюць свой "трэці". Яны рэалісты і не вабяць ні сябе, ні іншых хуткім адкрыццём панацэі ад СНІДу. Ад сінтэзу да стварэння новага лекавага прэпарата праходзіць не меней за 15-20 гадоў. Супрацоўнікі лабараторыі ідуць больш кароткім шляхам. Але ж часам і на яго можа не хапіць усяго чалавечага жыцця.

*Марына АВЕРКІНА*

# ВОРАГІ ПА КРЫВІ

Масавым кампаніям по нарыхтоўцы донарскай крыві практычна кожнага, хто пажадае, пакладзены канец. Донары паступова становяцца кадравымі. Гэта памяншае пагрозу заражэння СНІДам. Але ўсё ж не выключана, што па самых добразычлівых матывах брат па крыві можа ператварыцца ў ворага. Заспакойвае толькі тое, што цэльная кроў для пералівання практычна не выкарыстоўваецца, а падчас перапрацоўкі няўстойлівы вірус гіне.

СНІДу прыемна гуляць у хованкі з катастрафічна беднай медыцынай. А задавальненне ганяцца за ім па усім арганізме, правяраючы донарскую кроў па поўнай праграме сапраўды дорага каштуе. На Беларусі не наладжаная вытворчасць неабходных для праверкі рэчываў, таму падчас агульнага абследавання выкарыстоўваецца прадукцыя расійскіх фірмаў, а для тэсціравання донарскай крыві бяруцца прэпараты вядомых заходніх фірмаў.

Справа ў тым, што прасцейшыя аналізы ў першыя 3-6 месяцаў ад заражэнння не заўсёды выяўляюць антыцелы ў крыві. Падчас ранняга заражэння іх проста няма. Калі праводзяцца больш складаныя даследаванні, выяўляецца, што вірус здольны доўга чакаць свайго часу. Элементарная праграма яго выяўлення ў такім выпадку абыходзіцца ў 200 долараў.

Самай высокай групай рызыкі лічацца ў медыкаў хворыя на гемафілію. Каб максімальна засцерагчы іх ад заражэння, донарскую кроў захоўваюць пад час сера-канверсійнага акна (пакуль не змогуць быць выяўлены антыцелы) у лядоўні пры тэмпературы -4°С, а затым ужо правяраюць на наяўнасць антыцелаў і пры адмоўным выніку выкарыстоўваюць. Праблематычна толькі, што наступная порцыя крыві донара, які прыйшоў праз тры месяцы, таксама будзе чыстай. Зноў патрабуецца замарозка. На такі кругазварот крыві ў лядоўнях нашы станцыі пералівання па тэхнічных прычынах пакуль не здольныя. Спецыялісты цешацца надзеяй, што пастаянныя донары людзі сумленныя.

*Зінаіда МАРАВА*


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**
Заснавальнік газеты - БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета надрукавана на Мінскай паліграфічнай фабрыцы "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3. Ум. друк. арк. 1. Падпісана ў друк у 12.00.*

*11 ВЕРАСНЯ. Зак. 1794. Т. 1000 экз. Бясплатна*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412, тэлефон 2206827.*

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*